# Незвычайныя магчымасці звычайнай бумагі

У кожнага чалавека ёсць свае любімыя заняткі, якія дапамагаюць весела і цікава бавіць час, здольныя ратаваць ад нуды або дэпрэсіі. Яшчэ нашы бабулі і матулі захапляліся рукадзеллем – шылі, вязалі, ткалі, упрыгожвалі дом living рознымі ўнікальнымі ручнымі вырабамі. Даравалі другое жыццё рэчам, якія даўно можна было б выкінуць.

Сёння ў эру спажывецкай сферы, калі прылаўкі крам ломяцца ад разнастайных тавараў, і, здавалася б, усё можна купіць, нашы прадстаўніцы прыгожага полу трацяць грошы з вялікай ахвотай на зыходныя матэрыялы, каб ствараць самім. Зараз вельмі модным стала захапляцца паперакручэннем, дакладней – квілінгам.



Наталля Суслянкова – адна з нешматлікіх у нашым Хоцімскім раёне, хто займаецца квілінгам на прафесійным узроўні. Для Наталлі Міхайлаўны гэта творчае і цікавае баўленне часу. Будучы па жыцці натурай захоплелай, умеючы добра вышываць, вязаць кручком і пруткамі, яна заўсёды імкнулася авалодаць нечым новым, незвычайным. Вось і не выстаяла яна перад абаяннем гэтай тэхнікі. Некалькі гадоў таму ў рукі ёй трапіў часопіс “Умелые ручкі”. Адразу зацікавілася, вывучыла літаратуру, асвоіла базавыя мадэлі, і ўжо шмат гадоў яна стварае цудоўныя працы: паштоўкі, магніты, карціны, якія служаць лепшымі падарункамі для родных, сяброў і суседзяў. І работы жанчыны настолькі прыгожыя, што прапаноўвалі рабіць на заказ, у гэтым я пераканалася сама.

– Наталля Міхайлаўна, што такое квілінг? Што тоіць у сабе незразумелае для многіх слова?

У перакладзе з англійскай мовы – гэта птушынае пёрка. Перш за ўсё, гэта тэхніка работы з паперай. Са скручаных тонка нарэзаных палосак і папер вырабляюцца сапраўдныя шэдэўры. З папяровых спіралей ствараюць кветкі і ўзоры, якія потым выкарыстоўваюць для ўпрыгожвання паштовак, альбомаў, падарункавых упаковак, рамак для фотаздымкаў.

У квілінга багатая і цікавая гісторыя. Гэта вельмі старажытны від мастацтва. Прыйшло ў Расію з Карэі. Просты і прыгожы від рукадзелля, які не патрабуе вялікіх расходаў. Лічуць, што з'явіўся ён адразу пасля таго, як зрабілі ў Кітаі паперу, 105 г. нашай эры, на Блізкім Усходзе і ў Старажытным

Ёгіпце, дзе манахіні стваралі медальёны, аправы для ікон і вокладкі для кніг, закручваючы на кончыку птушынага пяра папяровыя палоскі з пазалочанымі краямі. У XV–XVI стагоддзі квілінг лічыўся мастацтвам, у XIX стагоддзі – дамскай забавай. У канцы XX стагоддзя квілінг зноў стаў мастацтвам. У Англіі прынцэса Лізавета сур'ёзна захаплялася квілінгам, і многія яе творы захоўваюцца ў музеі Вікторыі і Альберта ў Лондане.

Квілінг – гэта магчымасць убачыць незвычайныя магчамасці звычайнай бумагі. Асвоіць тэхніку можа кожны, тым больш, што ніякіх асаблівых прылад і не трэба. Толькі папера і цярпенне. Самае галоўнае ў гэтай тэхніцы – умелыя рукі майстра.

– Колькі часу вы затрачваеце на стварэнне вашых работ?

– Усё залежыць ад складанасці той ці іншай работы, – распавядае мая суразмоўца. Напрыклад, на стварэнне сваёй першай працы я затраціла дзесьці каля гадзіны, але зразумела, што яна была самай простай. Калі праца са складанымі элементамі – бывае – і дзень, але ніколі не больш за тры дні. Калі праца складаная і аб'ёмная, мне дапамагае муж. У працэс уцягнутая ўся сям'я, а яна ў нас творчая: муж добра малюе, што перадалося старэйшай дачцэ. І малодшы сын таксама зацікавіўся квілінгам. Калі яму было толькі пяць гадоў, ён мне проста дапамагаў, а цяпер і сам робіць ндрэнныя кампазіцыі, паштоўкі, розныя фігуркі.

– Раскажыце падрабязней пра тэхніку квілінга. Як жа якасна круціць модулі? Якой яны могуць быць формы? Чым замацоўваць дэталі?

– Канешне, можна скручваць палоскі рукамі, але гэта вельмі доўга і марудна. Ёсць спецыяльныя інструменты для квілінга і наборы паперы, але, на шчасце, можна абысціся і без іх. У кожнага дома ёсць папера, нажніцы і клей ПВА. Гэтага ўжо дастаткова для творчасці ў стылі квілінг. Для вырабаў можна выкарыстоўваць простую белую паперу. Калі хочацца стварыць каляровы выраб, то лепш узяць паперу, афарбаваную з абодвух бакоў. Для нарэзвання папосак (менавіта яны потым скручваюцца) зручней карыстацца макетным нажом, чым нажніцамі. Закручваць палоскі, прытрымліваючы кончык пазногцем, можна на зубачыстку або на стрыжань ад шарыкавай ручкі. Стрыжань знізу лепш надрэзаць і ўставіць туды пачатак папоскі. Такім чынам яна замацоўваецца і лёгка закручваецца. Закручаны модуль можна пакінуць круглым ці, сціснуўшы пальцамі, надаць форму слёзкі або кропелькі. Потым усе модулі злучаюцца ў адзін выраб пры дапамозе склейвання. Лепш выкарыстоўваць кпей ПВА.

– Ці кожнаму пад сілу асвоіць гэтую тэхніку?

– Як я ўжо рассказвала, мой маленькі сынок легка асвоіў тэхніку, складае кампазіцыі, я яму толькі крыху дапамагаю. Шмаітлікія работы ўдзельнічаюць у розных конкурсах, і гэта заўседы першыя, другія месцы. Шмат гадоўу нашай школе №1 працаваў гурток пад маім кіраўніцтвам "Чароўны завіток". Дзеці другіх-чацвертых класаў хутка навучыліся рабіць элементы і стваралі цудоўныя кампазіцыі, іх працы прымалі ўдзел у раённых і абласных конкурсах. У дзетак заняткі квілінгам развіваюць творчыя здольнасці і фантазію, густ. Таму вывад рабіце самі.

Як казаў Шэкспір: “Праца, якую мы выконваем з ахвотаю, вылечвае”. І сапраўды, стаміўшыся за дзень, бярэш у рукі паперу, пачынаеш скручваць ролы, і цябе захапляе, зачароўвае будучая кампазіцыя. Адразу пачынаеш думаць, як лепш паставіць завіток, якую паперу ўжываць. І ўсе твае клопаты і турботы адыходзяць на другі план. Тварыце і вы, таму што тварыць – значыць не паддавацца смерці.

**Іна ДЗМІТРАЧКОВА**

**Дзмітрачкова, І.** Незвычайныя магчымасці звычайнай бумагі : аб захапленні Наталлі Суслянковай / Іна Дзмітрачкова // Шлях Кастрычніка. — 2014. — 18 кастрычніка. — С. 6.